## На фоне апошніх падзеяў

Сялянска–работніцкая прэса ў апошнія часы аказалася гэтак прыдушанай, што блізу зусім перастала дахадзіць да вёскі. Затое адначасна вёска закідваецца буржуазнымі выданьнямі, якія могуць шмат каго чыста абаламуціць.

Запраўды ж: польскія ўрадавыя ўстановы ганьбуюць пакінуўшых іх людзей[1] як быццам не за тое, што выракліся супрацоўніцтва зь імі, а іменна за *факт гэтага супрацоўніцтва!* Мала таго: колішнім сваім супрацоўнікам, якія працай сваей стараліся пакіраваць урадавую палітыку ў непажаданым для *сягоньняшняга* ўрадавага курсу кірунку, прыпісваюцца няслушна „заслугі“ такога характару, што яны могуць проста забіць маральна чалавека. І ў гэтай акцыі прымаюць учасьце ня толькі блізкія да ўраду партыі, але ўся агулам польская буржуазія дый іншыя „меншасьцёвыя“ групы — з нашымі сельсаюзьнікамі і хадэкамі на чале!

Адначасна адбываецца паход проці Грамады. Слухаючы соймавыя прамовы беларускіх паслоў з варожых Грамадзе партыяў, можа здацца, што яны запраўды шчыра бароняць сваіх заарыштаваных калегаў–грамадаўцаў. Але пачытайце хадэцкую і сельсаюзьніцкую прэсу, і вы ўбачыце, што — адначасна з такімі на пагляд пекнымі прамовамі ў Сойме — і „Беларуская Крыніца“, і „Сялянская Ніва“ не спыняюць сваей зьвягі на Грамаду, паўтараючы закіды проці яе, як проці „камуністаў“, ды гэтак *апраўдваючы паступкі ўраду,* проці каторых паслы Ярэміч і Рагуля так, здаецца, „шчыра“ пратэставалі з соймавае трыбуны!

Як жа пагадзіць такія дзіўныя зьявішчы, як салідарны паход *„нашых“* сельсаюзьнікаў і хадэкаў — поплеч з *польскімі* буржуазнымі партыямі — проці грамадаўскіх і блізкіх да іх дзеячоў, а таксама проці пасла Ваявудзкага? Чым растлумачыць факт, што павадыры хадэкаў і сельсаюзьнікаў у прыватных гутарках стараюцца нягодна ачарняць найвыдатнейшых дзеячоў радыкальнага кірунку, займаючых кіраўнічыя становішчы ў беларускім адраджэнскім руху наагул?

Сучасны момант тым і цікаўны, што ён выявіў тую глыбокую *ідэалягічную розьніцу,* якая існуе паміж беларускім сялянска–работніцкім рухам і яго ідэолягамі — з аднаго боку, ды хадэцка–сельсаюзьніцкім кірункам — з другога. Хадэкі і сельсаюзьнікі настолькі розьняцца ад грамадаўскага руху *сацыяльна,* што — нягледзячы на супольнасьць нацыянальных ідэалаў — пачуваюць сябе *бліжэйшымі да польскае буржуазіі,* чым да грамадаўцаў. І затым–та хадэкі і сельсаюзьнікі стаюцца натуральнымі саюзьнікамі польскае буржуазіі, калі тая змагаецца з польскім ці зь беларускім *сацыяльным радыкалізмам* — з „энпэхамі“ („Незалежна Партыя Хлопска“) і з Грамадой. Паскольку ж паны Рагулі і Ярэмічы выступаюць у Сойме, баронячы заарыштаваных паслоў ад выдачы іх суду, дык тут справа йдзе аб узаканеньне ці неўзаканеньне ўжытае ўрадам сыстэмы барацьбы зь нямілымі яму партыямі, бо ж тое, што сталася з грамадаўцамі, як *сацыяльнымі радыкаламі,* можа стацца з другімі групамі, як *радыкаламі нацыянальнымі.*

Вось разгадка недаўменнага на першы пагляд пытаньня: чаму хадэкі і сельсаюзьнікі, якія йшчэ так нядаўна нападалі на паслоў Тарашкевіча і інш. за „разьбіцьцё адзінага нацыянальнага фронту“, бачачы ў гэтым найвялікшы грэх, цяпер, у момант разгрому польскай бужуазіяй наймагутнейшае — статысячнае — беларускае масавае арганізацыі, распачалі асабліва энэргічны паход проці дзеячоў і павадыроў гэтае арганізацыі, не перабіраючы ні ў якіх спосабах ганьбаваньня ведамых барацьбітоў за волю і правы беларускага народу. „Адзінства нацыянальнага фронту“ аказалася *фікцыяй* у найбольш цяжкую для беларускага руху часіну: яго разьбілі розьніцы *сацыяльнага* характару, абярнуўшы ўчорашніх прыяцеляў — у ворагаў, а ўчорашніх ворагаў — у саюзьнікаў.

Беларускі нацыяналізм, узгадаваны на грунце буржуазнага сьветапагляду, стараецца разьбіць найвялікшую частку *беларускага нацыянальнага актыву,* які, натуральна, ня можа зьмясьціцца ў вузкіх рамках буржуазнае ідэалёгіі. Беларускі нацыяналізм хоча зьнішчыць

акурат тыя беларускія актыўныя сілы, якія ўсьцяж тварылі і твораць нацыянальнае культурнае багацьце. І ў гэтым — *ягонае банкруцтва!*

Але ніякая сіла, ніякія фізычныя ці маральныя ўдары ня здольны разьбіць беларускага сялянска–работніцкага актыву: зьнішчыць яго можна толькі адначасна зь фізычным зьніштажэньнем нацыі.

## Д–р Ян Басановіч

Яшчэ так нядаўна літоўскае грамадзянства ўрачыста сьвяткавала падвойны юбілей д–ра Яна Басановіча — 75–лецьце ўрадзін і 50–лецьце грамадзкае працы; так нядаўна гаварыліся гарачыя прывітальныя прамовы да Яго — жывога... А вось сяньня мы прымушаны пісаць аб гэтым найвыдатнейшым з павадыроў адраджэнскага руху сярод літвінаў як аб нябожчыку, як аб тым, хто быў, тварыў, працаваў і вось ужо перайшоў на страніцы гісторыі...

Імя д–ра Басановіча — гэта быццам сьцяг, за якім у працягу паўсотні гадоў ішлі літоўскія адраджэнцы. Зь яго іменем зьвязана першая літоўская газэта „Aušra“, выдаваная ў Тыльжы (у Прускай Літве) ад 1883 году. Зь яго пачыну адбыўся ў 1905 годзе ў Вільні вялікі ўселітоўскі зьезд, які да лёзунгаў расейскае Рэвалюцыі далучыў лёзунг аўтаноміі Літвы. Ён жа — бацька літоўскае Навукі, закладчык Літоўскага Навуковага Т–ва ў Вільні, аўтар чысьленых навуковых прац і дасьледаў у літоўскай мове. І ўся гэтая дзеяльнасьць Яго — гэта ж падстава, на якой вырасла сучасная Літва, яе незалежнае гаспадарства.

Дык тым вялікшы сум мусіў агарнуць літоўскае грамадзянства, што сьмерць яго ідэйнага Павадыра выпала якраз на дзень сьвяткаваньня 10–лецьця незалежнасьці Літвы (16 лютага)[1].

Шчыра спагадаем братняму Літоўскаму Народу з прычыны ўтраты Сына Літвы, які ўсё жыцьцё сваё аддаў на служэньне роднаму Краю.

## Страшнае прадвесьне

Прадвесьне — найцяжэйшая пара ў жыцьці нашае вёскі.

Дый ня дзіва: Заходняя Беларусь — гэта край вялікіх дворных абшараў і тыповага сялянскага малазямельля. Ня маючы якой–колечы паважнай статыстыкі зямельных адносінаў з навейшага часу і заглянуўшы ў даваенныя досьледы (з 1909 году), мы ўбачым, што ўжо тады ў межах Заходняе Беларусі было 107 650 сялянскіх гаспадарак *меншых за 2 гектары,* 195 980 — ад 2 да 5 гектараў, 138 800 — ад 5 да 10 гектараў, і толькі 50 000 зь нечым гаспадарак былі адносна заможныя — мелі звыш 10 гектараў. Ведама, пры добрай глебе — жыць сяк–так можна было б; ды толькі глеба гэная ў нас пераважна бедная, слабаўрадлівая, і можна сьмела сказаць, што *гаспадаркі першых дзьвюх катэгорыяў, якія складаюць разам 61% усяе лічбы сялянскіх гаспадарак, вядуць паўгалоднае жыцьцё*. І калі да вайны такія тыповыя малазямельнікі мелі сякі–такі заработак на старане, ці то ідучы ў места, ці працуючы ў двары, дык цяпер гэты заработак у значнай меры адпаў: у места йсьці няма па што, а ў двары і парабкаў пачалі ўжо выпісваць з каранное Польшчы...

Пры такім палажэньні ды пры вельмі значных падаткавых цяжарах, якія плоце вёска, даволі навет невялікага недароду, каб напрадвесьні ў нашы вёскі завітаў няпрошаны госьць — *голад.* А сёлета[1] ўся паўночна–ўсходняя часьціна Заходняе Беларусі крэпка пацярпела ад неўраджаю. Да таго ж у прыгранічным поясе дагэтуль яшчэ людзі не адбудаваліся пасьля ваеннае руіны, і толькі сёлета польскі ўрад пастанавіў паважней заняцца гэтай справай...